Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Нацыянальны інстытут адукацыі

**Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў па гісторыі Беларусі для вучняў XI класа агульнаадукацыйных устаноў**

# Ад БССР да Рэспублікі Беларусь: выбар шляхоў развіцця.

*Аўтар-складальнік: С. В. Паноў*

Мінск 2009


Образовательный портал www.adu.by / Национальный институт образования

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

*Актуальнасць* правядзення факультатыўных заняткаў абумоўлена мэтазгоднасцю дасягнення якасці гістарычнай адукацыі праз засваенне старшакласнікамі змястоўнага і дзейнаснага кампанентаў вучэбных гістарычных ведаў аб пасляваенным і сучасным перыядзе развіцця БССР і Рэспублікі Беларусь і сацыялізацыі асобы праз фарміраванне ў школьнікаў якасцей, якія неабходны для выканання сацыяльных функцый, абумоўленых агульнапрынятай ў сучасным беларускім грамадстве сістэмай каштоўнасцей.

*Мэта* правядзення факультатыўных заняткаў заключаецца ў авалоданні вучнямі асновамі ведаў аб падзеях, з’явах, працэсах, тэндэнцыях у гісторыі Беларусі другой паловы 1940-х гг. – пачатку XXI ст., пададзеных рэпрэзентатыўна ў форме адпаведных дакументаў і матэрыялаў крыніцазнаўчага характару у іх узаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці.

Зыходзячы з мэтай факультатыва яго *задачамі* з’яляюцца наступныя:

– сістэматызацыя і абагульненне тэарэтычнага, факталагічнага і ацэначнага кампанентаў вучэбных гістарычных ведаў аб гісторыі Беларусі другой паловы 1940-х гг. – пачатку XXI ст.;

– асэнсаванне вучнямі тэндэнцый і перспектыў развіцця беларускага грамадства ў пасляваенны час і на сучасным этапе і фарміраванне на гэтай падставе інтэлектуальных якасцей асобы, неабходных для аналізу сацыяльнай рэчаіснасці і прагназіравання ўласнай жыццядзейнасці, у тым ліку прафесійнага самавызначэння;

– фарміраванне грамадзянскага патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці, пачуцця гонару за культурна-гістарычныя дасягненні беларускага народа.

Вучэбнай праграмай прадугледжваецца фарміраванне ў старшакласнікаў *дзейнаснага кампанента* гістарычнай адукацыі, прадстаўленага пералікам спосабаў дзейнасці, якія выпрацоўваюцца ў працэсе выкарыстання пісьмовых гістарычных крыніц рознага характару. Сярод такіх спосабаў


Образовательный портал www.adu.by / Национальный институт образования

дзейнасці, якімі авалодваюць вучні, наступныя: уменне суадносіць адпаведныя з’явы і працэсы айчыннай і сусветнай гісторыі найноўшага часу, у прыватнасці савецкай і агульнаеўрапейскай; уменне характарызаваць сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае становішча Беларусі; уменне ацэньваць вынікі дзейнасці гістарычных асоб і дзеячаў культуры; уменне тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж падзеямі, з’явамі і працэсамі; уменне адрозніваць гістарычны факт ад яго інтэпрэтацыі; уменне канкрэтызаваць з дапамогай дакументаў і матэрыялаў тэарэтычныя высновы і паняцці; уменне тлумачыць розныя пункты гледжання на гістарычныя падзеі, прадстаўленыя ў дакументах. Комплекс пералічаных спосабаў дзейнасці складае дзейнасны кампанент гістарычнай адукацыі ў старэйшых класах, які рэалізуецца ў працэсе арганізацыі вучэбнай працы з дакументальнымі гістарычнымі матэрыяламі, якія ў рознай ступені рэпрэзентатыўнасці адлюстроўваюць заканамернасці і асаблівасці развіцця беларускага савецкага і сучаснага грамадства. Пералічаныя спосабы вучэбна-пазнавальнай дзейнасці фарміруюцца праз арганізацыю працы вучняў з метадычным апаратам да тэкстаў дакументаў і матэрыялаў, які ўяўляе сабой комплекс рознаўзроўневых пытанняў і заданняў, у тым ліку пошуковага характару.

Дакументальныя матэрыялы, якія прадугледжваецца выкарыстоўваць у працэсе арганізацыі факультатыўных заняткаў, уяўляюць сабой іх *змястоўны кампанент*. Яны ахопліваюць падзеі пасляваеннага аднаўлення у БССР, грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця беларускага народа ў другой палове 1950-х–1980-я гг., з’явы культурнага жыцця, працэс абвяшчэння і станаўлення дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, тэндэнцыі яе грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця ў другой палове 1990-х гг. – пачатку XXI ст. Дакументальныя матэрыялы, якія размешчаны ў выданнях, прадстаўленых у спісе рэкамендуемай літаратуры, маюць шматпланавы характар, што дазваляе азнаёміцца і прааналізаваць розныя бакі жыцця беларускага грамадства. Частка дакументаў і матэрыялаў прадстаўлена афіцыйнымі заканадаўчымі, статыстычнымі матэрыяламі


Образовательный портал www.adu.by / Национальный институт образования

(пастановы партыйна-урадавых органаў, органаў дзяржаўнай улады і кіравання, паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця, у тым ліку ў перыядычным друку). Другая частка – матэрыяламі эпісталярнага жанру, якія маюць асобасны характар (успаміны, мемуары, пісьмы, звароты).

Пры арганізацыі факультатыва варта ўлічваць, што гісторыя Беларусі можа вывучацца на розных узроўнях: як складовая частка савецкай гісторыі, г. зн. у кантэксце сусветнай, як самастойная ў перыяд абвяшчэння і замацавання дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, а таксама на краязнаўчым узроўні, што прадугледжвае ўвядзенне у зварот часткі дакументальных матэрыялаў мясцовага характару.

Выкарыстоўваць на факультатыўных занятках дакументы і матэрыялы ў якасці гістарычных крыніц і адпаведны метадычны апарат, прадстаўленыя ў дыдактычных матэрыялах і метадычных рэкамендацыях, рэкамендуецца паслядоўна ў адпаведнасці з лінейным прынцыпам праходжання вучэбнага матэрыялу па адпаведных гістарычных перыядах і тэмах. Форма правядзення факультатыва прадугледжвае арганізацыю ў максімальнай ступені самастойнай практыка-арыентаванай дзейнасці вучняў па засваенні адпаведнага зместу праз фарміраванне адпаведных уменняў, звязаных з арыентацыяй у вучэбным інфармацыйным асяроддзі. Сярод рэкамендуемых форм правядзення факультатыва варта адзначыць вучнёўскае даследаванне ў выглядзе праекта ці рэферата з выкарыстаннем комплексу гістарычных крыніц.

На правядзенне факультатыва прадугледжваецца 35 вучэбных гадзін — па адной вучэбнай гадзіне на тыдзень пры вывучэнні гісторыі Беларусі другой паловы 1940-х гг. – пачатку XXI ст. на працягу вучэбнага года ці дзве вучэбныя гадзіны на тыдзень пры праходжанні адпаведнага вучэбнага матэрыялу толькі ў другім паўгоддзі. Прадугледжваецца выкарыстанне матэрыялаў факультатыва для правядзення перадэкзаменацыйнага паўтарэння ў выпадку выбару вучнямі экзамена па гісторыі Беларусі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі. Настаўнік мае права змяніць

паслядоўнасць і пераразмеркаваць колькасць вучэбных гадзін пры вывучэнні зместу матэрыялу факультатыва.

**ЗМЕСТ**

**Уводзіны** (2 гадз.) Разнастайны характар дакументаў і матэрыялаў па гісторыі Беларусі другой паловы 1940-х гг. – пачатку XXI ст. Вучэбны алгарытм работы з гістарычнымі дакументамі і матэрыяламі. Спосабы дзейнасці, фарміруемыя пры працы з гістарычнымі дакументамі.

## Раздзел I. БССР у другой палове 1940-х – першай палове 1950-х гг. (6 гадз.)

**Працоўны гераізм насельніцтва Беларусі пры пераадоленні наступстваў вайны.** Характарыстыка і вызначэнне крыніц працоўнага энтузіязму і ролі сацыялістычнага спаборніцтва ў аднаўленні і развіцці прадпрыемстваў народнай гаспадаркі БССР у гады чацвёртай пяцігодкі.

**Пасляваенная індустрыялізацыя БССР: яе асаблівасці і вынікі.** Вызначэнне апераджальнай ролі цяжкай прамысловасці ў гады пятай пяцігодкі. Выхад на новы ўзровень прамысловага развіцця.

**Асаблівасці аднаўлення сельскай гаспадаркі.** Меры па аднаўленні сельскай гаспадаркі. Характарыстыка метадаў правядзення калектывізацыі ў заходніх абласцях Беларусі.

**Асаблівасці грамадска-палітычнага жыцця БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.** Вызначэнне ролі і месца Камуністычнай партыі Беларусі ў савецкай грамадска-палітычнай сістэме. Характарыстыка сутнасці марксісцка-ленінскай ідэалогіі.

**Асаблівасці культурнага жыцця беларускага народа.** Вызначэнне ролі адукацыі і навукі ў БССР у пасляваенным адраджэнні рэспублікі. Параўнальны аналіз сістэмы ўсеагульнага 7-гадовага навучання, вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай школы БССР з сучасным адукацыйным асяроддзем.


Образовательный портал www.adu.by / Национальный институт образования

**Літаратура і мастацтва.** Адлюстраванне прынцыпу партыйнасці і метаду сацыялістычнага рэалізму ў творчасці дзеячаў культуры ў першыя пасляваенныя гады.

**Раздзел ІІ. БССР у другой палове 1950-х — 1980-я гг.: дасягненні і праблемы грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця** (13 гадз.)

**Дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця ў БССР у другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг.** Парадак правядзення выбараў у Саветы дэпутатаў працоўных. Характарыстыка дзейнасці К. Т. Мазурава. Характарыстыка дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да царквы.

**Сацыяльна-эканамічнае развіццё рэспублікі ў другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг.** Фарміраванне прамысловага комплексу БССР. Вызначэнне індустрыяльнага характару эканомікі БССР. Умовы жыцця насельніцтва.

**Грамадска-палітычнае становішча ў другой палове 1960-х — першай палове 1980-х гг.** Роля дэпутатаў у грамадскім і сацыяльна-эканамічным жыцці насельніцтва рэспублікі. Канстытуцыйнае замацаванне кіруючай ролі Камуністычнай партыі. Характарыстыка дзейнасці П. М. Машэрава.

**Сацыяльна-эканамічнае становішча БССР у другой палове 1960-х — першай палове 1980-х гг.** (2 гадз.). Вызначэнне месца і ролі БССР у адзіным народнагаспадарчым комплексе СССР. Роля сацыялістычнага спаборніцтва ў развіцці прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Дасягненні гаспадаркі БССР у міжнародным падзеле працы.

Развіццё сацыяльнай сферы. Параўнальны аналіз узроўню жыцця насельніцтва БССР на працягу другой паловы 1960-х — першай палове 1980-х гг. з сучасным. Вызначэнне характэрных рысаў паўсядзённага жыцця жыхароў БССР.

**Грамадскасць БССР у падзеях міжнароднага жыцця.** Водгукі і рэакцыя насельніцтва БССР на падзеі “Карыбскага крызісу” і падзеі 1968 г. у

Чэхаславакіі. Вызначэнне ролі жанчын-прадстаўніц БССР у рэалізацыі палажэнняў міжнародных дамоўленасцей аб рэалізацыі праў жанчын.

**Спробы паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця ў другой палове 1980-х гг.** Неабходнасць пераадольвання зніжэння тэмпаў эканамічнага росту. Характарыстыка праграмы пераходу Беларускай ССР да рыначнай эканомікі. Вызначэнне ролі калгасна-саўгаснай формы вытворчасці ў развіцці аграрнага сектара эканомікі.

**Сацыяльна-эканамічныя наступствы аварыі на Чарнобыльскай АЭС для насельніцтва Беларусі** (2 гадз.) Вызначэнне характару аварыі на Чарнобыльскай АЭС як тэхнагеннай катастрофы і яе наступстваў для насельніцтва забруджаных раёнаў Беларусі і яе гаспадаркі. Параўнанне пазіцыі прадстаўнікоў улады і грамадскасці па пытанні пераадолення сацыяльных наступстваў аварыі.

Вызначэнне палажэнняў Дзяржаўнай праграмы ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

**Развіццё адукацыі і навукі ў БССР у другой палове 1950-х — 1980-я гг.** Вызначэнне ролі вышэйшай і ўсеагульнай сярэдняй адукацыі, прафесійна-тэхнічнага навучання ў сацыяльна-эканамічным развіцці БССР. Вызначэнне характару ідэалагічнай работы сярод вучнёўскай моладзі па яе выхаванні. Характарыстыка дасягненняў вучоных БССР у фарміраванні індустрыяльнага грамадства ва ўмовах навукова-тэхнічнага прагрэсу.

**Статус беларускай мовы ў другой палове 1950-х — 1980-я гг.** Характарыстыка нацыянальных адносін у Савецкім Саюзе ва ўмовах існавання канцэпцыі аб фарміраванні новай гістарычнай супольнасці — савецкага народа. Вызначэнне прычын абмежавання ўжытку беларускай мовы. Характарыстыка падыходаў да вырашэння моўнага пытання ў БССР. Роля заканадаўчага афармлення статусу беларускай мовы.

**Месца беларускай савецкай літаратуры ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі ў другой палове 1950-х — 1980-я гг.** Афіцыйная і ўласная пазіцыі беларускіх пісьменнікаў пры асвятленні тэмы Вялікай Айчыннай

вайны ў творах І. Шамякіна, В. Быкава, А. Адамовіча. Адлюстраванне лёсаў беларусаў у творчасці І. Мележа. Гістарычная тэматыка ў творчасці У. Караткевіча.

**Беларускае савецкае мастацтва ў другой палове 1950-х – 1980-я гг.** Вызначэнне парадку ажыццяўлення метаду сацыялістычнага рэалізму ў беларускім кінамастацтве. Адлюстраванне тэмы Вялікай Айчыннай вайны ў творах беларускіх скульптараў. Вызначэнне музычных захапленняў беларускай моладзі.

## Раздзел III. Рэспубліка Беларусь у 1991—2008 гг: станаўленне і развіццё

(12 гадз.)

**Станаўленне дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі.** Значэнне Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР 1990 г. у вызначэнні шляху развіцця Беларусі ва ўмовах нарастання крызісных з’яў. Вызначэнне ролі Белавежскага пагаднення ў спыненні існавання СССР і стварэнні СНД.

**Грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове 1990-х гг. -пачатку XXI ст.** (2 гадз.) Асновы дзяржаўнага ладу суверэннай Рэспублікі Беларусь у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. (са змяненнямі і дапаўненнямі, прынятымі на рэспубліканскіх рэферэндумах 1996 і 2004 гг.). Вызначэнне асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы.

Дзяржаўная сімволіка Рэспублікі Беларусь. Рэспубліканскі рэферэндум 1995 г. і яго вынікі. Дзяржаўныя ўзнагароды Рэспублікі Беларусь. Героі Беларусі.

**Асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь** (4 гадз.). Характарыстыка прычын эканамічнага становішча Рэспублікі Беларусь, якое склалася ў першай палове 1990-х гг. Вызначэнне шляхоў пераадолення крызісных з’яў у эканоміцы і пераходу да рыначных адносін.

Вызначэнне ролі рашэнняў Усебеларускіх народных сходаў у сацыяльна-эканамічным развіцці Рэспублікі Беларусь. Характарыстыка сутнасных рыс


Образовательный портал www.adu.by / Национальный институт образования

беларускай мадэлі сацыяльнаарыентаванай рыначнай эканомікі і механізмаў яе рэалізацыі.

Індэкс чалавечага развіцця ў Рэспубліцы Беларусь. Вызначэнне прычын дэмаграфічнага становішча ў Рэспубліцы Беларусь. Характарыстыка асноўных накірункаў дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі.

Сусветны фінансава-эканамічны крызіс і вызначэнне шляхоў пераадолення яго наступстваў у Рэспубліцы Беларусь.

**Міжнароднае становішча і знешнепалітычная дзейнасць Рэспублікі Беларусь** (3 гадз.). Характарыстыка ролі суверэннай Рэспублікі Беларусь у абнаўленні дзейнасці Арганізацыі Аб’яднаных Нацый. Ініцыятывы Рэспублікі Беларусь у ААН.

Вызначэнне характару інтэграцыі Рэспублікі Беларусь на былой постсавецкай прасторы з краінамі Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Месца і роля Беларусі ў Еўразійскім эканамічным супольніцтве. Характарыстыка інтэграцыйнага працэсу Беларусі і Расіі. Вызначэнне перспектыў стварэння Саюзнай дзяржавы паміж Беларуссю і Расіяй.

Характарыстыка геапалітычнага становішча Рэспублікі Беларусь і шматвектарнасці яе знешняй палітыкі. Роля Беларусі ў ажыццяўленні дзейнасці Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе. Вызначэнне перспектыў удзелу Рэспублікі Беларусь у праграмах “Партнёрства дзеля міру” і “Усходняе партнёрства”.

**Развіццё навукі, адукацыі і культуры ў Рэспубліцы Беларусь** (2 гадз.). Першы з’езд вучоных Беларусі і роля навукі ў інавацыйным развіцці Беларусі. Характарыстыка працэсу мадэрнізацыі нацыянальнай сістэмы адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Вызначэнне становішча беларускай мовы і яе ролі ў захаванні культурна-гістарычнага асяроддзя беларускага народа.

Адлюстраванне гістарычнага мінулага беларускага народа ў творах сучаснай беларускай літаратуры і мастацтва. Дасягненні беларускіх спартсменаў.

## ЧАКАЕМЫЯ ВЫНІКІ

У выніку правядзення факультатыўных заняткаў вучні засвойваюць змястоўны кампанент, г.зн.:

– накірункі эвалюцыі эканамічнага становішча і савецкай палітычнай сістэмы ў БССР у перыяд пасляваеннага аднаўлення;

– асноўныя тэндэнцыі грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця беларускага народа ў другой палове 1950-х – 1980-я гг.;

– сутнасныя рысы беларускай савецкай літаратуры і мастацтва;

– тэндэнцыі і перспектывы станаўлення і развіцця суверэннай Рэспублікі Беларусь.

У працэсе авалодання вучнямі дзейнасным кампанентам факультатыва ў іх фарміруюцца наступныя ўменні:

– суадносіць (параўноўваць) адпаведныя падзеі, з'явы і працэсы айчыннай і сусветнай гісторыі найноўшага часу на падставе пісьмовых гістарычных крыніц рознага характару;

– тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж узаемаабумоўленымі гістарычнымі падзеямі, з'явамі і працэсамі;

– ацэньваць вынікі дзейнасці гістарычных асоб і дзеячаў культуры і характарызаваць матывацыйную аснову іх дзейнасці;

– адрозніваць гістарычныя факты ад іх інтэпрэтацыі;

– канкрэтызаваць з дапамогай дакументаў і матэрыялаў тэарэтычныя высновы і паняцці;

– супастаўляць і тлумачыць розныя пункты гледжання на гістарычныя падзеі, прадстаўленыя ў дакументах;

– ажыццяўляць пошук, збор, сістэматызацыю і абагульненне неабходнай гістарычнай інфармацыі, прадстаўленай у крыніцах рознага тыпу.

Дасягненне мэтаў і выкананне задач факультатыва будзе садзейнічаць паспяховай здачы выпускнога экзамена на выбар па гісторыі Беларусі на


Образовательный портал www.adu.by / Национальный институт образования

ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама пры падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання па гісторыі Беларусі.

## РЭКАМЕНДУЕМАЯ ЛІТАРАТУРА

### Асноўная

Антонович, С. Пётр Машеров. — Мінск, 1993.

Беларусь на мяжы тысячагодзяў. — Мінск, 2000.

Беларусь: выбор пути. Национальный отчёт о человеческом развитии. — Мінск, 2000.

Вішнеўскі, А. Ф., Юхо, Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах. (Са старажытных часоў да нашых дзён): вучэб. дапам.; пад агул. рэд. праф. А. Ф. Вішнеўскага. — 2-е выд. дап. — Мінск, 2003.

Вяземский, Е. Е., Стрелова, О. Ю. Методические рекомендации учителю истории : Основы профессионального мастерства: практ. пособие. — М., 2000.

Гістарычны шлях беларускай нацыі і дзяржавы / М. Біч, Р. Гарэцкі, У. Конан [і інш.]. — Мінск, 2007.

Гісторыя Беларусі XIX — пачатак XXI ст.; пад рэд. Я. К. Новіка. — Мінск, 2009.

Гісторыя Беларусі найноўшага часу ў дакументах і матэрыялах. Хрэстаматыя / уклад. Ю. Бачышча; нав. рэд. А. Смалянчук. —Вільня, 2008.

Знешняя палітыка Беларусі. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. — Т. 1–2. — Мінск, 1997, 1999.

История Беларуси в документах и материалах; авт.-сост. И. Н. Кузнецов, В. Г. Мазец. — Минск, 2000.

История Беларуси (октябрь 1917 г. – начало XXI в.; под ред. Я. И. Трещенка. — Минск, 2009.

Казлоў, Л., Цітоў, А. Беларусь на сямі рубяжах. — Мінск, 1993.

Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці : XX стагоддзе. М. П. Касцюк [і інш.]. — Мінск, 2008.

Современная Беларусь : энциклопедический справочник: в 3 т. — Мінск, 2006—2007.

Суверенитет и многовекторность внешней политики Рекспублики Беларусь. — Мінск, 2000.

Хрестоматия по истории БССР (1917—1983); сост. А. П. Игнатенко, В. Н. Сидорцов, П. З. Савочкин, А. И. Сидоренко. — Минск, 1984.

Хрестоматия по истории БССР; сост. И. Е. Марченко; под ред. И. С. Кравченко. — Мінск, 1988. — Ч. 2.

Цітоў, А. К. Геральдыка Беларусі (ад пачаткаў — да канца XX стагоддзя). — Мінск, 2007.

Шалькевіч, В. Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі. — Мінск, 2002.

Шевцов, Ю. Объединённая нация. Феномен Беларуси. — М., 2005.

**Дадатковая**

Адамушка, У. Палітычныя рэпрэсіі 20–50-х гадоў на Беларусі. – Мінск, 1994.

Беларусы: у 8 т. – Мінск, 1995–2004.

Бригадин, П. И. История Беларуси в контексте европейской истории: курс лекций. — Мінск, 2007.

Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў па 2008 г.; пад рэд. Я. К. Новіка. — Мінск, 2009.

250 асоб з Беларусі ў дыялогах культур. — Мінск, 2008.

Иоффе, Э. Г. От Мясникова до Малофеева. Кто руководил БССР. — Мінск, 2008.

Касцюк, М. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі. — Минск, 2000.

Лінднэр, Р. Гісторыкі і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX—XX ст. — СПб, 2005.

Лыч, Л. Гісторыя культуры Беларусі. — Мінск, 2008.

Мяснікоў, А. Ф. Сто асоб беларускай гісторыі; гістарычныя партрэты. — Мінск, 2008.

Нарысы гісторыі Беларусі; пад рэд. М. П. Касцюка. У 2 ч. — Мінск, 1995. — Ч. 2.

Никитенко, П. Г. Модель устойчивого социально-экономического развития Беларуси: проблемы формирования и эволюции. — Минск, 2000.

Памяць: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. — Мінск, 1985—2004.

Снапкоўскі, У. Е. Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі: у 2-х ч. Вучэб. дапаможнік. — Мн., 2004.

Сарокін, А. М. На ростанях айчыннай гісторыі. Беларуская вёска: ад Дэкрэта да Кодэкса аб зямлі (1917—1990-я гады). — Мінск, 1999.

Сачанка, Б. Беларуская эміграцыя. — Мінск, 1991.

Слука, А. Г. Нацыянальная ідэя: шлях народа. — Мінск, 2005.

Чигринов, П. И. Очерки истории Беларуси. — Мінск, 2006.

Эканамічная гісторыя Беларусі; пад агул. рэд. В. І. Галубовіча. — Мінск, 2005.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. — Мінск, 1993—2003.

Юхо Я.А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. — Мінск, 2003. — Ч. 2.

## Інтэрнэт-рэсурсы

| Назва партала, сайта | Электронны адрас |
|---|---|
| Афіцыйны інтэрнет-партал Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь | http://www.president.gov.by |
| Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі | http://history.minsk.by |
| Нацыянальная бібліятэка Беларусі | http://www.nlb.by |
| Архівы Беларусі | http://archives.gov.by |
| Асацыяцыя «Гісторыя і камп’ютар» | http://www.dcn-asu/internet/index.shtml |
| Віртуальны курс лекцый па гісторыі Беларусі | http://www.belarusianhistory.narod.ru |
| Беларускі гістарычны агляд | http://gw.lingvo.minsk.by |
| Беларускі краявід | http://www.kraj.org |
| Беларусіка-Albaruthenica | http://gw.lingvo.minsk.by/mab/@book/index.htm |
| Гісторыя Беларусі. Асобы | http://tbm.org.by |
| Глобус Беларусі | http://globus.tut.by |
| Гісторыя Беларусі | http://albaruthenia.by |
| Міжнароднае грамадскае згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» | http://www.zbsb.org |
| Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі | http://niab.belhost.by |
| Нацыянальны мастацкі музей Беларусі | http://museum.bsu.by |